# Беларуская пошта прыняла ўдзел у Міжнародным філатэлістычным біенале “Россика-2016”



Беларуская пошта прыняла ўдзел у Міжнародным філатэлістычным біенале “Россика-2016” (Расійскі дом навукі і культуры ў Берліне, 20-22 мая 2016 г.).

Выстава арганізавана пад патранажам Еўрапейскай Акадэміі Філатэліі (ЕАФ) і Міжнароднай Асацыяцыі выдаўцоў філатэлістычных каталогаў (ASCAT).

РУП “Белпошта” прадставіла два экспаната (“Каталог паштовых марак Рэспублікі Беларусь. 2014 год”, “Каталог паштовых марак Рэспублікі Беларусь. 2015 год”) для ўдзелу ў конкурсным класе “Філатэлістычная літаратура”.

Міжнароднае журы высока ацаніла прадстаўлены матэрыял, прысвоіўшы экспанатам “БРОНЗУ”.

**Source URL:** *https://xn--b1akbcqh2a7i.xn--90ais/news/19-07-2016-964*